**Інструкцыя для трансферных і транзітных пасажыраў, якія накіроўваюцца ў Расійскую Федэрацыю, Арменію або Казахстан**

**1.** Вы прылятаеце ў Нацыянальны аэрапорт Мінск і ў суправаджэнні супрацоўніка аэрапорта перамяшчаецеся ў аэравакзальны комплекс.

**2**. Вы накіроўваецеся да кабін пашпартнага кантролю.

**3.** Пасля праходжання пашпартнага кантролю, калі ваш багаж быў зарэгістраваны толькі да Мінска, то яго неабходна атрымаць. Калі багаж быў зарэгістраваны да канцавога пункта, пераходзьце да пункта 4. гэтай інструкцыі.

**4.** Далей вы накіроўваецеся на мытны кантроль.

**5.** Пасля праходжання мытнага кантролю вы адпраўляецеся ў аэравакзальны комплекс аэрапорта. Для таго каб прайсці на свой наступны рэйс, вам неабходна падняцца на трэці паверх (выкарыстоўваючы ліфт або эскалатары, якія размешчаны ў зале).

**6.** Апынуўшыся на трэцім паверсе аэравакзальнага комплексу пры наяўнасці пасадачнага талона на наступны рэйс і адсутнасці багажу, або калі ён зарэгістраваны да канцавога пункта, вам неабходна накіравацца ў пункт нагляду пасажыраў (на схеме яны абазначаны лічбай **6**).

Калі ваш багаж не зарэгістраваны на наступны рэйс, вам неабходна падысці да стойкі рэгістрацыі на рэйс, што размешчаны на трэцім паверсе, для афармлення багажу на рэйс. Пасля гэтага накіруйцеся да пунктаў нагляду пасажыраў (на схеме яны абазначаны лічбай **6**).

**7.** Прайшоўшы перадпалётны нагляд, вы трапляеце ў так званую ***"стэрыльную"*** зону вылету, дзе знайшоўшы свой выхад на пасадку, чакаеце вылету або накіроўваецеся на пасадку.

***Звяртаем вашу ўвагу****: Грамадзяне трэціх краін, у якіх адсутнічае транзітная віза Рэспублікі Беларусь, з зоны прылёту па лесвічным пралёце або выкарыстоўваючы ліфт, падымаюцца на ўзровень 2-га паверха, дзе ў зоне абслугоўвання трансферных пасажыраў праходзяць: кантроль праязных дакументаў, перадпалётны нагляд, зону мытнага кантролю і далей ідуць у залу вылету на 3-і паверх для праходжання пашпартнага кантролю праз кабіны пашпартнага кантролю «ТРАНСФЕР: Арменія, Казахстан, Расія» і выхаду на пасадку № № 10-13.*